# РОСТ СІЛ СОВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Дзесятая сесія Вярхоўнага Совета СССР, якая закончыла сваю работу, прадэманстравала перад усім светам аднадушша і непахіснасць сталінскай дружбы совецкіх народаў, рост магутнасці совецкай дзяржавы.

Ад імя Совецкага Урада з дакладам «Аб ператварэнні Наркамата Абароны і Наркамата Замежных Спраў з агульнасаюзных у саюзна-рэспубліканскія Наркаматы» выступіў Намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. Молатаў. У сваім выдатным, глыбока змястоўным дакладзе тав. Молатаў паказаў гістарычнае значэнне гэтых дзяржаўных ператварэнняў.

Сесія зацвердзіла закон, згодна якога саюзныя рэспублікі арганізуюць свае вайсковыя фарміраванні. У сувязі з гэтым Народны Камісарыят Абароны з агульнасаюзнага ператвараецца ў саюзна-рэспубліканскі Наркамат. Рэалізацыя гэтага закона бясспрэчна прывядзе да далейшага ўмацавання абароннай магутнасці Совецкага Саюза. Цяпер наспелі ўсе ўмовы для такога ператварэння. Кожная саюзная рэспубліка мае не толькі кадры радавых байцоў, але і здольных кіраўнікоў каманднага састава. Да таго-ж стварэнне рэспубліканскіх наркаматаў Абароны яшчэ больш узмацніць увагу рэспублік да пастаноўкі ваеннага навучання ў навучальных установах.

Беларускі народ разам з усімі брацкімі народамі Совецкага Саюза вітае гэта гістарычнае рашэнне сесіі. У ходзе Айчыннай вайны наш народ паказаў многа ўзораў масавага гераізма і мужнасці ў барацьбе за чэсць, свабоду і незалежнасць нашай совецкай радзімы. Беларускі народ усімі сіламі дапамагае Чырвонай Арміі, якая на сваіх сцягах нясе вызваленне совецкім людзям і смерць нямецкім захопнікам. Народ наш з любоўю і гордасцю сочыць за гістарычнымі поспехамі Чырвонай Арміі, якая перад усім светам развеяла хлусню аб непераможнасці фашысцкай арміі, нанесла і наносіць сакрушальныя ўдары па ворагу і цяпер вядзе гераічную барацьбу за вызваленне Украіны і Беларусі, рыхтуе блізкае ўжо вызваленне ўсёй совецкай зямлі. І таму беларускі народ прыкладзе ўсе свае намаганні, каб узорным выкананнем прынятага сесіяй закона аб стварэнні рэспубліканскіх вайсковых фарміраванняў яшчэ больш умацаваць сілу сваёй роднай горача любімай Чырвонай Арміі.

Сесія Вярхоўнага Совета прыняла закон «Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб ператварэнні ў сувязі з гэтым Народнага Камісарыята Замежных Спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі Народны Камісарыят». Такім чынам, пашыраюцца правы саюзных рэспублік і ў галіне знешніх зносін. Закон гэты аднолькава выказвае інтарэсы як усяго Совецкага Саюза, так і кожнай саюзнай рэспублікі паасобку.

Разам з умацаваннем совецкай дзяржавы ўмацаваліся і яе міжнародныя пазіцыі. Міжнародныя сувязі СССР яшчэ больш пашырыліся і ўмацаваліся ў ходзе Айчыннай вайны. Аб гэтым яскрава гавораць такія факты, як узнікненне і рост магутнасці антыгітлераўскай кааліцыі, якая ўзначальваецца Совецкім Саюзам, Вялікабрытаніяй і Злучанымі Штатамі Амерыкі. Саюз і дружба антыфашысцкіх краін яшчэ больш умацуюцца пасля немінучай перамогі над гітлерызмам. Умацаванне міжнародных сувязей Совецкага Саюза выклікала неабходнасць ператварэння агульнасаюзнага Наркамата Замежных Спраў у саюзна-рэспубліканскі Наркамат. Кожная саюзная рэспубліка мае нямала спецыфічных гаспадарчых і культурных патрэб, якія могуць быць вырашаны больш паспяхова шляхам непасрэдных зносін саюзных рэспублік з замежнымі дзяржавамі.

Прынятыя сесіяй законы аб дзяржаўных ператварэннях—гэта новая бліскучая перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Сталінская дружба народаў яшчэ больш умацавалася ў ходзе вайны. Совецкі Саюз з чэсцю вытрымаў усе выпрабаванні вайны. І чым далей ідзе Совецкі Саюз па шляху свайго гістарычнага развіцця, тым больш яго народы імкнуцца ўмацаваць сваю дружбу, дапамагчы адзін аднаму.

Ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, партыя большэвікоў і совецкі ўрад усё больш садзейнічаюць нацыянальнаму развіццю народаў Совецкага Саюза.

Бліскучыя поспехі Чырвонай Арміі, якая нясе на сабе ўвесь цяжар барацьбы з галоўнымі сіламі гітлераўскай арміі, з'яўляецца яркім доказам сілы совецкага ладу.

Законы, прынятыя сесіяй Вярхоўнага Совета, якія вядуць да пашырэння правоў саюзных рэспублік, сведчаць аб сіле нашай дзяржавы, аб упэўненасці ў нашай хуткай перамозе. Гэтая ўпэўненасць і дае нашай краіне магчымасць ажыццявіць такія важныя дзяржаўныя ператварэнні.

Увесь совецкі народ, як ніколі згуртаваны вакол партыі Леніна—Сталіна, аднадушна вітае новыя дзяржаўныя ператварэнні, зацверджаныя сесіяй Вярхоўнага Совета, бо ўпэўнены, што яны будуць садзейнічаць далейшаму ўмацаванню нашай дзяржавы, хуткаму разгрому нямецка-фашысцкіх акупантаў.

## *Абвяржэнне ТАСС*

На працягу апошняга тыдня замежны друк працягвае сцвярджаць, што совецкі ўрад вядзе перагаворы аб сепаратным міру з Фінляндыяй і што нібыта Совецкі Саюз прад'явіў Фінляндыі ультыматум.

ТАСС упаўнаважаны заявіць, што гэтыя паведамленні ні ў якой меры не адпавядаюць сапраўднасці.

# АДНАЎЛЕННЕ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БУДМАТЭРЫЯЛАЎ

Да вайны Клімавіцкі сілікатны завод даваў у год 2 мільёны 100 тысяч штук цэглы. Нямецкія бандыты разбурылі завод, нанеслі яму страт больш чым на паўтары мільёны рублёў.

Па рашэнню Урада Наркамат будматэрыялаў прыступіў да аднаўлення завода. Аднаўленчыя работы першай чаргі, на якія асігнавана 1 мільён 200 тысяч рублёў, дадуць магчымасць ужо ў 1944 годзе давесці выпрацоўку цэглы да даваеннага ўзроўню. З пускам другой чаргі выпуск прадукцыі павялічыцца ў 3—4 разы.

На заводзе існаваў цэх па выпрацоўцы вапны, якая ішла галоўным чынам для будаўніцтва. Акупанты разбурылі яго. Цэх цяпер аднаўляецца і ў маі гэтага года павінен даць першую прадукцыю.

Вялікія страты нанеслі немцы вапнаваму заводу № 2 у Клімавічах. Абсталяванне выведзена са строю. Але абследванне паказала, што яго можна аднавіць. За гэтую справу ўжо ўзяліся. Завод дасць 5.000 тон вапны. Вясной гэтага года прадпрыемства ўступіць у строй.

Цагляныя заводы Гомеля №№ 5, 6 і 17 разбураны нямецка-фашысцкімі акупантамі. На месцы печаў, сушылак, навесаў—кучы шчэбню, гліны. Немцы спрабавалі выпускаць цэглу на заводзе № 5; за два гады яны здолелі вырабіць 200 тысяч цаглін... Да вайны-ж гэты завод выпускаў 12—13 мільёнаў штук цэглы ў год.

Тэхнічная камісія абследвала ўсе гэтыя прадпрыемствы, устанавіла страты, нанесеныя немцамі, распрацавала мерапрыемствы па іх аднаўленню. У маі завод будзе пушчан.

Аднаўленчая праца пачалася і на другіх заводах. Аднаўляецца гофманская печ на заводзе № 6.

Для падрыхтоўкі кадраў для прадпрыемстваў будматэрыялаў ствараюцца кароткатэрміновыя курсы фармаўшчыкоў, садчыкаў, абпальшчыкаў, а таксама планавікоў, рахункаводаў, статыстыкаў.

**С. ШАПАВАЛАВА.**

# Са сталінскім імем у сэрцы

Мы ў партызанскай вёсцы Т. Жыхары гэтай вёскі, ад старага да малага, усе ў партызанах.

Атрад жыве напружаным баявым жыццём. Учорашнія сяляне сёння ходзяць на баявыя аперацыі, нясуць ахову вёскі.

На радыё атрад звязан з роднай Масквой, і ўсе тут ведаюць, як жыве вялікі Совецкі Саюз.

..Сувязіст прывёз партызанскія газеты, у якіх надрукаван даклад таварыша Сталіна аб 26-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Газеты бяруцца нарасхват. Кожны хоча хутчэй даведацца, што сказаў таварыш Сталін.

...У сялянскай хаце сабраліся партызаны. Яны вярнуліся з баявой аперацыі і, нягледзячы на стомленасць, прышлі на гутарку па дакладу таварыша Сталіна. На сцяне вялікая карта. Агітатар Лаўрэнці А., які да вайны працаваў дырэктарам сярэдняй школы і выкладчыкам гісторыі, чытае даклад таварыша Сталіна. Ён паказвае на карце тэрыторыю, якая вызвалена Чырвонай Арміяй ад нямецкіх захопнікаў.

Пажылая сялянка Кацярына адкладвае ў бок верацяно і ловіць вухам кожнае слова. Простыя, нераканаўчыя словы правадыра глыбока западаюць у сэрца, умацоўваюць упэўненасць у блізкае вызваленне.

Прагай помсты нямецкім душагубам поўняцца сэрцы, калі агітатар чытае пра зверствы немцаў на часова акупіраванай совецкай тэрыторыі. Фашысцкія бандыты дзесяткі разоў бамбілі вёску Т. Ператвораныя ў руіны хаты з'яўляюцца нямымі сведкамі разбойніцкіх спраў нямецкіх грамілаў.

— Мы прымусім нямецкіх злачынцаў трымаць адказ за ўсе іх злачынствы!—гэтыя словы любімага правадыра сустракаюцца ўсеагульным адабрэннем.

Актывізацыяй баявых дзеянняў, новымі ўдарамі па акупантах адказваюць народныя мсціўцы на заклік таварыша Сталіна. За апошнія месяцы падрыўнікі атрада пусцілі пад адкос 11 варожых эшалонаў, у тым ліку 7 эшалонаў з жывой сілай. Пад абломкамі вагонаў знайшлі сабе магілу 967 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Падрыўнік Рыгор А. мае на сваім рахунку чатыры ўзарваныя эшалоны. Тры эшалоны падарваў партызан Мікола Т.

Зараз, калі немцы адкатваюцца пад магутнымі ўдарамі чырвоных воінаў, спяшаючыся вывезці нарабаваныя ў Беларусі багацці, партызанскі атрад імені героя беларускага народа Льва Даватара ўзмоцнена дзейнічае на адной з важных камунікацый. Толькі за апошнія тыдні партызаны надбілі больш 20 нямецкіх аўтамашын і знішчылі 235 гітлераўцаў. Ні днём, ні ноччу не даюць яны спакою нямецкім акупантам.

Сталінскае слова—слова вялікай жыццёвай праўды натхняе і вядзе народных мсціўцаў у бой за поўнае вызваленне роднай зямлі ад нямецкіх захопнікаў.

**Піліп К.**

Партызанскі атрад імені Даватара.
МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ.

# АКТЫВІСТЫ-ПАТРЫЁТЫ

Чырвоная Армія ачысціла Гомель ад нямецкіх акупантаў, і ў горад прышлі яго сапраўдныя гаспадары. З вёсак вярнуліся жанчыны, дзеці і старыкі, якія хаваліся ад немцаў. Вышлі з лясоў бясстрашныя народныя мсціўцы—партызаны. Два з лішкам гады яны вялі жорсткую барацьбу з нямецкімі акупантамі, а цяпер прышлі будаваць.

Знявечаны, паранены ўбачылі яны свой любімы горад. Кожны з болем успамінаў квітнеючы Гомель, які быў да вайны. Няма больш прыгожых, зялёных вуліц. Не дымяцца коміны заводаў і фабрык. Не бягуць радасныя дзеці ў школы. Няма кіно і тэатраў. Пустэча, пажарышчы, руіны.

— Горад будзе жыць!—сказалі вызваленыя гомельчане. Яны ішлі ў выканкомы Советаў, прапаноўвалі свае паслугі.

З першых актывістаў былі створаны вулічныя камітэты. Па нашаму Цэнтральнаму раёну ёсць 22 такіх камітэты. Яны аб'ядноўваюць больш 170 чалавек. У асноўным гэта хатнія гаспадыні, інваліды. Яны энергічна дапамагаюць выканкому райсовета ў вырашэнні асноўнай задачы—аднаўленні горада, разбуранага нямецкімі акупантамі.

Перш за ўсё патрабавалася ўлічыць жыллёвы фонд і даць прытулак пагарэльцам. Вулічныя камітэты дапамаглі райвыканкому і за некалькі дзён выявілі 500 кадратных метраў жыллёвай плошчы.

Хатнія гаспадыні і школьнікі, арганізаваныя вулічнымі камітэтамі, дапамаглі органам міліцыі ў перарэгістрацыі пашпартаў грамадзян і прапісцы.

На нашаму раёну налічваецца 246 сем'яў франтавікоў. Камітэты аказваюць ім садзейнасць у атрыманні дзяржаўнай дапамогі, клапоцяцца аб забеспячэнні апалам і т. д.

Камітэты сочаць за чыстатой горада. Вуліцы, двары ачышчаны ад лому. Закончан збор жалеза і металалому на пагарэлішчах. Гэта ўсё работа вулічных камітэтаў.

Актыўны ўдзел прынялі хатнія гаспадыні ў агульнагарадскім суботніку. Сярод 1416 чалавек, якія прышлі на суботнік, было паўтараста хатніх гаспадынь. За дзень было сабрана 128 тон кравельнага жалеза, 19 тон металалому, падабрана 35 кубаметраў іншага лому.

Але не толькі гэтым абмяжоўваецца ўдзел вулічных камітэтаў. Амаль штодзённа працуюць хатнія гаспадыні, пенсіянеры на аднаўленчых работах водаканалтрэста. Хутка будзе адбудаван вадаправод, горад атрымае ваду, і ў гэтым частка працы жанчын і пенсіянераў. Пры актыўным удзеле жыхароў аднаўляюцца ложкавая фабрыка і іншыя прадпрыемствы.

Асабліва добра працуюць старшыні вулічных камітэтаў Дзенісевіч і Юстус—на Падгорнай вуліцы, Бакіноўская—на Нова-Ветранай вуліцы, Маркелаў—на вуліцы Камісарава, Саньева — на вуліцы Тэльмана, Санькоў—на Піонерскай.

Шматгранны абавязкі вулічных камітэтаў. Апрача гаспадарчых работ, яны праводзяць выхаваўчую работу сярод хатніх гаспадынь. Два з лішнім гады фашысцкая ілжывая прапаганда атручвала свядомасць грамадзян. Выкрыць нямецкую брахню, расказаць жыхарам праўду аб Совецкім Саюзе, аб Чырвонай Арміі—абавязак вулічных камітэтаў. І трэба сказаць, што многія актывісты добра працуюць на сваіх участках. Напрыклад, тав. Жывулька і Прахарэнка правялі гутаркі і чыткі кнігі таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза».

Так працуюць вулічныя камітэты нашага раёна.

**А. ПАТЫКА,**
**намеснік старшыні выканкома райсовета Цэнтральнага раёна горада Гомеля.**

